Л. М. Боханка

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## Планы-канспекты ўрокаў

3 клас

I паўгоддзе

*Дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі*

Мазыр
«Выснова»
2022

# Прадмова

Прапанаваныя ў метадычным дапаможніку планы-канспекты ўрокаў складзены згодна з дзеючымі вучэбнымі праграмамі для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Мэта дапаможніка — палегчыць падрыхтоўку настаўніка да ўрока ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі да арганізацыі адукацыйнага працэсу па беларускай мове на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Размеркаванне вучэбнага матэрыялу адпавядае зместу падручніка: Свірыдзенка В. І. Беларуская мова : вучэбны дапаможнік для 3 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання / В. І. Свірыдзенка. — Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2017.

Аўтар ужывае заданні, якія стымулююць пазнавальную актыўнасць вучняў, патрабуюць самастойнага пошуку інфармацыі, яе выкарыстання для выканання вучэбных і практычных задач. Таксама прапануюцца практыкаванні на ўзбагачэнне слоўнікавага запасу навучэнцаў, засваенне вымаўленчых нормаў і правілаў правапісу, развіццё творчых здольнасцей пры стварэнні ўласных вусных і пісьмовых выказванняў.

Змест працы па каліграфіі звязваецца з фанетычным, лексічным, граматычным матэрыялам.

Безумоўна, матэрыял неабходна выкарыстоўваць творча, улічваючы псіхалагічныя асаблівасці вучняў, а таксама іх здольнасць успрымаць вучэбны матэрыял.

## Урок 1

# Паўтарэнне: гукі і літары

**Мэта:** паўтарэнне і замацаванне ведаў пра гукі мовы, алфавіт.

**Задачы:**

- арганізаваць дзейнасць па актуалізацыі ведаў вучняў пра гукі мовы, іх абазначэнне на пісьме літарамі;
- адпрацоўваць уменні адрозніваць галосныя і зычныя гукі, націскныя і ненаціскныя галосныя, цвёрдыя і мяккія зычныя;
- выпрацоўваць вымаўленчыя навыкі, развіваць звязнае маўленне;
- выхоўваць цікавасць да вучобы, павагу да разумных людзей.

**Абсталяванне:** падручнік (частка 1); карткі “Г..Л..СН..”, “З..ЧН..”; малюнкі ці сапраўдныя рэчы: партфель, пенал, папка для сшыткаў, фламастар; схемы-апоры па беларускай мове.

## Ход урока

### I. Арганізацыйны этап.

Вучні чытаюць вершаваныя радкі з дошкі:

*Бывай, гаманлівае звонкае лета!*
*Нясём мы ў класы вясёлкі букетаў,*
*Мы бор абуджалі гамонкай вясёлай.*
*Бывай, лета звонкае! Крочым у школу.*

*С. Грахоўскі* [8]

— Я віншую вас з пачаткам навучальнага года.

### 2. Актуалізацыя ведаў і ўменняў вучняў.

**2.1. Чыстапісанне.**

— Разгледзьце малюнкі (прадметы), назавіце рэчы, вызначце, які гук паўтараецца ў кожнай назве.

(Вучні разглядаюць малюнкі (прадметы) і называюць: партфель, пенал, папка для сшыткаў, фламастар. На дошцы з’яўляюцца дэфармаваныя запісы: *п..ртф..ль, п..н..л, п..пк.. дл.. сш..тк..ў, фл..м..ст..р*. Вызначаюць, што паўтараецца гук [*а*].)

— Які гэты гук: галосны ці зычны?

Гук [*а*] абазначаюць на пісьме літары *А, а*. Гэтыя літары мы запішам у сшытках, а таксама склады і словы з імі:

***Гульнявы прыём “Сям’я і сябры”.***

— Кожная літара складаецца з элементаў. Таму **на першым радку чыстапісання** ідзе “нараджэнне літар”.

**На другім радку** літары знаёмяцца і вучацца правільна падаваць ручкі адна адной, каб не разгубіць элементы літар і не прысвоіць чужыя. Таму спачатку стаіць літара, якая вывучаецца першай, а затым яны мяняюцца месцамі. Існуе таксама літара ў абводцы, — яна адпраўляецца ў Інтэрнэт.

**На трэцім радку** запісваюцца словы з выкарыстаннем прыёму “Нараджэнне слова”. Пасля запісу слоў ставіцца націск, над ім запісваецца, які па ліку націскны склад. Вертыкальнай лініяй словы дзеляцца на склады, а дугой знізу — для пераносу. Вусна складаюцца з гэтымі словамі словазлучэнні або сказы.

*ооо ііі ааа /// lll А А А Аа Аа Аа*

*ал ам Ав ае Аз ах Ан ар* @@ *ма па*

*партфель рукзак ранец*

— Што агульнага ў гэтых словах? (Блізкія па сэнсе.)

Знайдзіце слоўнікавае слова. *(Ру<u>к</u>зак.)*

Якую літару трэба запомніць пры напісанні гэтага слова? Які гук яна абазначае?

Успомнім назвы школьных прылад па схеме [23, Л. 16]:

**школа**
**настаўнік**
**вучань**
**вучаніца**
**вучыцца**
**клас**
**дошка**
**расклад урокаў**
**ранішнік**
**свята**
**спартландыя**
**бацькоўскі сход**






**дзённік**
**сшытак**
**падручнік**
**пенал**
**аловак**
**ручка**
**стрыжань**
**гумка**
**фарбы**
**пэндзаль**
**нажніцы**
**рукзак**








**2.2. Хвілінка адкрыццяў.**

— Якія бываюць гукі мовы?

Вось для вас падказка: карткі-памяткі пра гукі мовы. Толькі з імі адбылася непрыемнасць — некаторыя літары згубіліся. Устаўце патрэбныя літары, і вы даведаецеся, якія ж бываюць гукі.

Г..Л..СН..                З..ЧН..

Чым адрозніваюцца галосныя і зычныя гукі?

Як падзяляюцца галосныя і зычныя гукі? Успомніць гэта нам дапаможа наш падручнік. (Вучні працуюць са схемай на с. 3 падручніка.)

**3. Прымяненне ведаў і ўменняў у практычнай дзейнасці.**

Паведамленне тэмы і мэт урока.

**3.1. Работа па падручніку с. 3, практ. 1.**

— У якіх выпадках у словах можа быць літар больш, чым гукаў?

**3.2. Работа па падручніку с. 5, практ. 5.**

Праверка.

***Фізкультхвілінка.***

— Як называецца такая гульня, у якой удзельнікі хаваюцца, а хтосьці шукае? (Хованкі.) Я прапаную вам пагуляць у новыя хованкі. Вядучы павінен будзе вызначыць, хто з вучняў памяняўся месцамі.

(З дапамогай лічылкі (практ. 5) выбіраецца вядучы, які на нейкі момант выходзіць з памяшкання або заплюшчвае вочы. Настаўнік знакамі прапануе некалькім вучням памяняцца месцамі. Вядучы павінен іх вызначыць. Гульня праводзіцца некалькі разоў.)

**4. Сістэматызацыя і абагульненне ведаў.**

**4.1. Работа па падручніку с. 4, практ. 2, 3.**

Узгадваецца правіла напісання вялікай літары.

**4.2. Моўная хвілінка.**

Дзеці чытаюць верш, запісаны на дошцы:

*Мая* ***Айчына*** *— поле, нівы,*
*Над* ***Нёманам*** *зялёны гай,*
*Прыгожы* ***Брэст*** *і* ***Мінск*** *шумлівы —*
*Уся* ***Беларусь*** *ад краю ў край.*

*Ул. Дубоўка* [19]

— Што абазначаюць выдзеленыя словы?

***Фізкультхвілінка.***

*Прыплылі хмары дажджавыя —*
*Лі, дожджык, лі!*
*Дажджынкі скачуць, як жывыя, —*
*Пі, жыта, пі!*
*І жыта, схіліўшыся*
*Да зямлі зялёнай,*
*П'е, п'е, п'е.*
*А дожджык, цёплы і вясёлы*
*Лье, лье, лье.*

*М. Пазнякоў* [13]

**7.2. Работа па падручніку с. 17, практ. 30.**

Самаправерка.

**8. Тэматычны тэст "Паўтарэнне".**

| *Варыянт 1* | *Варыянт 2* |
|---|---|
| 1. Змяніце словы па ўзоры і запішыце іх.<br>[*д*]–[*дз*'] (*горад – у горадзе*); [*т*]–[*ц*'] (*пошта – на пошце*) | |
| *гняздо – ...*<br>*прырода – ...*<br>*газета – ...*<br>*куст – ...* | *сад – ...*<br>*вада – ...*<br>*жыта – ...*<br>*балота – ...* |
| 2. Успомніце правапіс *о, э–а, е, ё–я*<br>і ўстаўце прапушчаныя літары. | |
| *ногі – н..га*<br>*цэны – ц..на*<br>*дзень – дз..нёк*<br>*мётлы – м..тла*<br>*пчолы – пч..ла*<br>*лес – л..сок*<br>*стрэхі – стр..ха* | *горка – г..ра*<br>*стрэлы – стр..ла*<br>*звер – зв..рок*<br>*сцены – сц..на*<br>*сосны – с..сна*<br>*гнёзды – гн..здо*<br>*рэкі – р..ка* |
| 3. Запісаць тры словы з падоўжанымі зычнымі. | |
| 4. Успомніце пастаноўку апострафа і раздзяляльнага *ь*.<br>Запішыце словы ў два слупкі. | |
| *Вераб..і, пад..езд, л..ецца, Ул..яна, сям..я, паштал..ён, пер..е, вал..ер.* | *Камп..ютар, надвор..е, міл..ён, сур..ёзны, павіл..ён, батал..ён, Дар..я, Іл..я.* |

| 5. Прачытайце сказы. Устаўце патрэбныя літары: *у* ці *ў*. | |
|---|---|
| *Летам Сяргейка адпачыва(у, ў) (у, ў) бабулі (у, ў) вёсцы Д(у, ў)бро(у, ў)на.* | *Дзяд(у, ў)ля Ягоркі жыве (у, ў) вёсцы Лясная, што (у, ў) Брэсцкай вобласці.* |

**9. Развіццё вуснага маўлення.**

**Работа па падручніку с. 17, практ. 29, вусна.**

Работа ў парах.

**10. Інструктаж па выкананні дамашняга задання.**

**Работа па падручніку с. 18, практ. 31.**

— Прачытайце словы з прапушчанымі літарамі. Якую літару або знак вы будзеце ўстаўляць? Чаму?

**11. Падвядзенне вынікаў.**

— Як вымаўляюцца і перадаюцца на пісьме падоўжаныя зычныя?

Як пераносіць словы з падоўжанымі зычнымі і раздзяляльнымі знакамі?

**12. Рэфлексія.**

— Пакажыце, які ў вас зараз настрой. (Вучні падымаюць сонейка ці хмарку.)

## Урок 6

## Прыметы тэксту

**Мэта:** фарміраванне ведаў пра тэкст шляхам усведамлення яго прымет.

**Задачы:**

- арганізаваць дзейнасць па актуалізацыі ведаў вучняў пра тэкст, яго асноўныя прыметы (тэма, асноўная думка, загаловак);
- прыгадаць ролю загалоўка ў тэксце;
- ствараць умовы, неабходныя для развіцця ўменняў вызначаць тэму і асноўную думку тэксту, падбіраць загаловак да тэксту, прагназаваць змест тэксту па загалоўку;
- садзейнічаць развіццю інтанацыйных навыкаў, узбагачэнню слоўнікавага запасу вучняў, развіццю вуснага звязнага маўлення;
- выхоўваць любоў да Радзімы.

**Абсталяванне:** падручнік (частка 1), карткі з заданнямі, схемы-апоры па беларускай мове.

## Ход урока

### 1. Арганізацыйны момант.

— Паглядзім адзін на аднаго, возьмемся за рукі, усміхнёмся, пажадаем добрага настрою і плённай працы.

Паўтарыце з рознай інтанацыяй наступныя сказы.

Ціха: “Хораша вучыцца разам.”

З пытальнай інтанацыяй: “Ці хораша вучыцца разам?”

Гучна: “Як хораша вучыцца разам!”

### 2. Праверка дамашняга задання.

— Прачытайце, растлумачце, якую літару або знак вы ўставілі.

### 3. Мэтаматывацыйны этап.

***Гульня “Літара збегла”.***

— Каб даведацца пра тэму сённяшняга ўрока, устаўце ў словы, запісаныя на дошцы, літары і складзіце з іх новае слова: *свя..а, Р..спубліка, жаўру.., Белару..ь, кве..кі. (ТЭКСТ.)*

(На дошцы можна размясціць схему-апору [23, Л. 3]).



**беларуская мова**



**беларусы**

**беларусачка**




**беларус**



**беларуска**

**бусел**

**Рэспубліка Беларусь**

— Задача, якую мы павінны вырашыць за ўрок — успомніць і паўтарыць, што ж такое *тэкст*. А яшчэ якія задачы вы можаце назваць?

## 4. Актуалізацыя ведаў і ўменняў вучняў.

**4.1. Чыстапісанне.**

— Паслухайце верш, вызначце, словы з якім гукам часта сустракаюцца ў ім, і здагадайцеся, якую літару мы запішам у сшытак:

*Беларусі ўсёй бязмежжа*
*Гэта літара хавае:*
*Бульба,*
*Бераг,*
*Белавежа,*
*Бор і вышка буравая.*
*У чырвоных новых ботах*
*Бусел тужыць па балотах.*

*Р. Барадулін* [3]

— Гукі [*б*] і [*б*'] абазначаюцца літарамі *Б, б*. Запішыце правільна і прыгожа.



*бе бі бя аб ыб уб Ба Бэ Бю*

*бульба бусел бор Рэспубліка Беларусь*

Назавіце слоўнікавыя словы. Чаму яны пішуцца з вялікай літары?

Як вы думаеце, верш, які вы праслухалі, з'яўляецца тэкстам? Чаму?

**4.2. Работа па падручніку с. 19, практ. 32, вусна.**

— Дакажыце, што першая група сказаў — гэта тэкст.

Успомніце, што такое *тэма тэксту*? Давайце разам вызначым тэму тэксту.

**4.3. Работа па падручніку, схема “Тэма тэксту” на форзацы 1, адказ на пытанне с. 19.**

## 5. Прымяненне ведаў і ўменняў вучняў у практычнай дзейнасці.

**5.1. Работа па падручніку с. 20, практ. 33.**

Узаемаправерка.

— Ці можна сказаць, што тэма гэтага тэксту адлюстравана ў загалоўку?

Што такое, па-вашаму, *Радзіма*?

## Змест

Прадмова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

Урок 1. Паўтарэнне: гукі і літары . . . . . . . . . . . . . . 4
Урок 2. Паўтарэнне: вымаўленне гукаў [*о*], [*э*], [*а*], правапіс літар *о, э–а; е, ё–я* ў словах . . . . . . . . 8
Урок 3. Паўтарэнне: вымаўленне гукаў [*у*] і [*ў*], правапіс *ў* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
Урок 4. Паўтарэнне: вымаўленне гукаў [*т*]–[*ц*'], [*д*]–[*дз*'], зацвярдзелых зычных, правапіс слоў з імі . . . . . 16
Урок 5. Паўтарэнне: вымаўленне і правапіс слоў з падоўжанымі зычнымі, правапіс слоў з апострафамі раздзяляльным *ь*. **Тэматычны кантроль па тэме "Паўтарэнне"** . . . . . . . . . . . . . . 20
Урок 6. Прыметы тэксту . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25
Урок 7. Спосабы выказвання асноўнай думкі ў тэксце . . . 30
Урок 8. Спосабы раскрыцця адной тэмы ў розных тэкстах. Сачыненне па пачатку і серыі малюнкаў . . . 34
Урок 9. План тэксту . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37
Урок 10. План тэксту . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 41
Урок 11. Прыметы сказа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
Урок 12. Тыпы сказаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
Урок 13. Апавядальныя сказы . . . . . . . . . . . . . . . . 51
Урок 14. Пытальныя сказы . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
Урок 15. Пытальныя сказы . . . . . . . . . . . . . . . . . . 58
Урок 16. Пабуджальныя сказы . . . . . . . . . . . . . . . . 62
Урок 17. Пабуджальныя сказы. **Кантрольны слоўнікавы дыктант** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
Урок 18. Клічныя сказы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
Урок 19. Клічныя сказы. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 73
Урок 20. Дзейнік і выказнік — галоўныя члены сказа . . . 76
Урок 21. Дзейнік і выказнік — галоўныя члены сказа . . . 81
Урок 22. Даданыя члены сказа . . . . . . . . . . . . . . . . 85
Урок 23. Даданыя члены сказа. Складанне тэксту па плане і апорных словах да карціны В. Цвірко "Вечар" . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 88

Урок 24. Абагульненне па раздзеле “Сказ”. **Кантрольная работа па тэме “Сказ”** . . . . . . . . . . . . . . 92
Урок 25. Аналіз кантрольнай работы. Значэнне слова . . . 95
Урок 26. Адназначныя і мнагазначныя словы . . . . . . . 99
Урок 27. Прамое і пераноснае значэнне слова . . . . . . . . . 102
Урок 28. Сінонімы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106
Урок 29. Антонімы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 110
Урок 30. Словы, аднолькавыя па гучанні, розныя па значэнні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 114
**Кантрольны дыктант** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 117
Урок 31. Аналіз вынікаў кантрольнага дыктанта. Роднасныя (аднакаранёвыя) словы. Корань слова . . . 119
Урок 32. Корань слова. Змены гукаў у каранях слоў . . . . 123
Урок 33. Корань слова. Змены гукаў у каранях слоў . . . . 127
Урок 34. Корань слова. Змены гукаў у каранях слоў . . . . 131
Урок 35. Правапіс парных звонкіх – глухіх зычных у корані слова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 135
Урок 36. Формы слова. Канчатак . . . . . . . . . . . . . . . 138
Урок 37. Формы слова. Канчатак . . . . . . . . . . . . . . . 142
Урок 38. Нулявы канчатак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 145
Урок 39. Формы слова і аднакаранёвыя словы (абагульненне). **Кантрольная работа па тэме “Склад слова. Корань”**. . . . . . . . . . . . . . . 148
Урок 40. Аналіз кантрольнай работы. Прыстаўка . . . . . . . 152
Урок 41. Прыстаўка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 155
Урок 42. Правапіс прыставак *аб-, ад-, над-, пад-, перад-, прад-* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 159
Урок 43. Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на *з (с)* . . . 162

Літаратура . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 165